ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1981
8
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 1 (1301)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

## Эстафету дасягненняў — адзінаццатай пяцігодцы!

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### СУСТРЭЧА СА СЛУХАЧАМІ

падрыхтоўчага аддзялення прайшла на юрыдычным факультэце. Дэкан юрфака В. Ф. Чыгір цікава і падрабязна расказаў прысутным аб гісторыі і традыцыях факультэта, аб яго выпускніках і выкладчыках, аб арганізацыі вучэбнага працэсу, умовах вучобы і быту студэнтаў. Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый факультэта пазнаёміліся з будучымі студэнтамі і адказалі на іх шматлікія пытанні.

А. ВОЙЦІК,
сакратар камітэта камсамола юрфака.

### НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ

членаў студэнцкага навуковага таварыства механіка-матэматычнага факультэта выступіў намеснік дэкана А. А. Шарамет, які адзначыў важнасць удзелу студэнтаў у навуковай рабоце і пажадаў усім як мага раней далучыцца да навуковых даследаванняў.

Прысутныя прынялі праект статута студэнцкага навуковага таварыства, які цяпер шырока абмяркоўваецца на факультэце.

С. СЯРГЕЕЎ,
студэнт IV курса мехмата.

### «МІР ПЛАНЕЦЕ»,

«Будзем разам змагацца за раззбраенне», «XXVI з'езду КПСС — пошук маладых», «Дасягненні НТР — у вытворчасць» — вось толькі некаторыя надпісы на плакатах, з якімі мастакі-аматары ФПМ прынялі ўдзел у конкурсе на лепшы палітычны плакат, што праводзіў факультэцкі камітэт камсамола.

Найбольш цікавыя работы прадставілі студэнты 4-й і 12-й груп другога курса.

А. ГЕРМАНОВІЧ.

### ЛІТАРАТУРНЫ КЛУБ

з серыі клубаў па інтарэсах сабраў аматараў паэзіі, прозы і музыкі гістарычнага факультэта. Арганізаваць яго вырашана пасля правядзення некалькіх літаратурна-музычных вечароў, прысвечаных творчасці рускіх і савецкіх паэтаў. У планах работы клуба: гутаркі аб сучасных кнігах, сустрэчы з літаратарамі, выступленні факультэцкіх паэтаў.

А. САРАКАВІК,
студэнтка IV курса гістфака.

### У ЧАС ЗІМОВЫХ

канікулаў дэканат па рабоце з замежнымі навучэнцамі прадастаўляе сваім выхаванцам магчымасць пазнаёміцца са славутымі гарадамі нашай Радзімы. Экскурсіі для замежных студэнтаў будуць арганізаваны ў Маскву, Ленінград, Кіеў, Адэсу, Ерэван, Ташкент, Данецк.

Т. АЛЯКСАНДРАВА.



НА ЗДЫМКУ: малодшыя навуковыя супрацоўнікі лабараторыі фізічнай хіміі цэлюлозы НДІ фізіка-хімічных праблем Л. Г. ЛУШЧЫК, А. В. БІЛЬДЗЮКЕВІЧ і тэхнік Н. М. ІГНАЦЕНКА працуюць над атрыманнем новых відаў гідратцэлюлозных валокнаў і плёнак з нягодных растваральнікаў цэлюлозы.

Фота М. Дубовіка.

**«У ГАЛІНЕ ПРЫРОДАЗНАЎЧЫХ І ТЭХНІЧНЫХ НАВУК СКАНЦЭНТРАВАЦЬ НАМАГАННІ НА... СТВАРЭННІ ХІМІКА-ТЭХНАЛАГІЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ АТРЫМАННЯ НОВЫХ РЭЧЫВАЎ І МАТЭРЫЯЛАЎ З ЗАДАДЗЕНЫМІ ЎЛАСЦІВАСЦЯМІ».**

*(З ПРАЕКТА ЦК КПСС ДА XXVI З'ЕЗДА ПАРТЫІ)*

## «Прапаную дапоўніць...»

**АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЕКТ ЦК КПСС «АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ЭКАНАМІЧНАГА І САЦЫЯЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ СССР НА 1981—1985 ГАДЫ І НА ПЕРЫЯД ДА 1990 ГОДА».**

НА ПАРТЫЙНЫХ і камсамольскіх сходах супрацоўнікаў і студэнтаў юрыдычнага факультэта, на пасяджэннях кафедр, якія былі прысвечаны абмеркаванню дакумента вялікай тэарэтычнай і практычнай важнасці, былі ўнесены 65 прапаноў і заўваг аб дапаўненні, змяненні ці ўдакладненні палажэнняў праекта ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі. Трэба адзначыць шматграннасць тэм, якія хвалююць юрыстаў. Большасць прапаноў і заўваг адносіцца да раздзела «Сацыяльнае развіццё і павышэнне народнага дабрабыту», аднак не засталіся без увагі і такія тэмы, як развіццё навукі і паскарэнне тэхнічнага прагрэсу, развіццё аграпрамысловага комплексу, размеркаванне прадукцыйных сіл, ахова прыроды, удасканаленне кіравання, павышэнне ўзроўню гаспадарання ва ўсіх звеннях эканомікі.

На пасяджэнні кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва ўнесена было шмат канкрэтных прапаноў.

**— Неабходна смялей праводзіць навуковыя эксперыменты ў дзяржаўным будаўніцтве, што павялічыць яго эфектыўнасць і забяспечыць скарачэнне колькасці работнікаў дзяржаўнага апарату. Пажадана з гэтай мэтай стварыць у маштабе СССР орган для каардынацыі і кантролю»,**— адзначыў у сваім выступленні загадчык кафедры прафесар А. А. Галаўко. Яму ж належыць наступнае дапаўненне: **«Неабходна распрацаваць заканадаўства, якое будзе дэталёва рэгуляваць стварэнне, функцыяніраванне аграпрамысловых комплексаў і іх узаемаадносіны з рознымі дзяржаўнымі органамі».**

Дацэнт Я. М. Тагуноў прапанаваў пасля сказа: «Паляпшаць работу апарату кіравання, скарачаць расходы на яго ўтрыманне, рашуча ліквідоўваць залішнія і дубліруючыя звенні» ўказаць, што **«гэта работа павінна праводзіцца на строга навуковай аснове, пазбаўленай элементаў суб'ектывізму, праводзіцца няўхільна; для каардынацыі гэтай работы мэтазгодна пры Камітэце народнага кантролю СССР стварыць міжведамасную камісію, якая будзе даваць абавязковыя для ўсіх міністэрстваў, дзяржаўных камітэтаў і ведамстваў указанні».**

Інтарэс выклікае меркаванне дацэнта А. Т. Лейзерава аб змене парадку назначэння стыпендый. Ён лічыць, што **«стыпендыю павінны атрымліваць усе студэнты, незалежна ад паспяховасці. Пры гэтым частка студэнтаў, чыя паспяховасць не задавальняе пэўным патрабаванням, атрымлівае стыпендыю ў выглядзе займа, які павінен быць пагашаны ў вызначаны перыяд пасля заканчэння ВНУ».**

Дацэнт М. Ф. Сцепаненка ўнёс некалькі мэтанакіраваных прапаноў па ахове прыроды. Такую, напрыклад: **«Разам з законам аб ахове навакольнага асяроддзя выдаць у рэспубліцы пералік правапарушэнняў, звязаных з парушэннем прыродаахоўнага заканадаўства, і ўказаць канкрэтныя меры адказнасці за іх».**

Не засталіся ў баку і праблемы развіцця юрыспрудэнцыі як навукі. Зроблены прапановы аб канкрэтных мерах па папярэджанню правапарушэнняў; завострана ўвага на ўмацаванні сувязей паміж тэорыяй і практыкай у працэсе навучання будучых юрыстаў.

Што ж датычыць заўваг, якія адрасуюцца непасрэдна Мінскаму ГК КПБ і Міністэрству вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, то яны ў асноўным накіраваны на паляпшэнне ўмоў работы і вучобы калектыву факультэта.

А. КРАМНІК,
намеснік сакратара партбюро юрфака.

● УВАГА: КОНКУРС!

## КЛОПАТ МАЛАДЫХ

УНІВЕРСІТЭЦКАЕ таварыства вынаходнікаў і рацыяналізатараў запрашае студэнтаў, якія актыўна займаюцца навуковай работай, і маладых супрацоўнікаў БДУ прыняць удзел у абласным туры рэспубліканскага конкурсу сярод камсамольцаў і моладзі на лепшае вынаходніцтва пад дэвізам «Беражлівасць — клопат маладых», які прысвечаны XXVI з'езду КПСС.

Абласны тур рэспубліканскага конкурсу праводзіцца з 1 снежня 1980 года па 1 лютага 1981 года сярод студэнтаў і супрацоўнікаў ва ўзросце не старэй за 33 гады. У конкурсе могуць прыняць удзел як асобныя маладыя вынаходнікі, так і калектывы ў саставе не больш за 5 чалавек.

Дазваляецца прадстаўляць камісіі вынаходніцтвы маладых аўтараў, якія былі пададзены і ўкаранёны ў народную гаспадарку на працягу 76—80 гадоў.

Пераможцамі абласнога тура будуць прызнаны аўтары і калектывы аўтараў тых вынаходніцтваў, укараненне якіх дазволіла атрымаць найбольшую эканомію народных сродкаў і дабіцца найвышэйшых паказчыкаў скарачэння і ліквідацыі ручной працы.

І. БАРДЗІЯН,
студэнтка факультэта журналістыкі.

«УЗМАЦНІЦЬ АХОВУ ПРЫРОДЫ, СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ УГОДДЗЯЎ, АТМАСФЕРНАГА ПАВЕТРА, ВАДАЁМАЎ, ЖЫВЁЛЬНАГА І РАСЛІННАГА СВЕТУ. ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ РАЦЫЯНАЛЬНАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ І ЎЗНАЎЛЕННЕ ПРЫРОДНЫХ РЭСУРСАЎ».

*(З ПРАЕКТА ЦК КПСС ДА XXVI З'ЕЗДА ПАРТЫІ).*

# КІРАВАЦЬ ПРЫРОДАКАРЫСТАННЕМ

АДНОЙ З АКТУАЛЬНЫХ ПРАБЛЕМ нашага часу з'яўляецца праблема аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў планеты. Патрэба прамысловасці ў сыравіне, шырокая хімізацыя сельскай гаспадаркі, рост гарадоў і іншыя аспекты ўздзеяння чалавека на прыродныя комплексы ставяць перад вучонымі нашай рэспублікі пэўныя задачы. Рашэнню некаторых з іх была прысвечана III канферэнцыя маладых вучоных БДУ імя У. І. Леніна «Сучасныя праблемы аховы, рацыянальнага выкарыстання і аднаўлення прыродных рэсурсаў», што адбылася ў канцы снежня мінулага года.

Канферэнцыя, якая праводзілася па ініцыятыве савета маладых вучоных геафака, стала ўжо традыцыйнай і выклікала вялікую цікавасць не толькі ў маладых вучоных універсітэта, але і прадстаўнікоў іншых навуковых арганізацый, якія займаюцца рашэннем прыродаахоўных праблем, — Акадэміі навук БССР, БелНДІ ЭМП пры Дзяржплане БССР, БелНДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі, ЦНДІ комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў, БелНДІ глебазнаўства і аграхіміі і інш.

Вялікую цікавасць выклікалі даклады Ю. Мандэра (Эстонская сельскагаспадарчая акадэмія, г. Тарту), В. Багданава, Е. Несцяроўскага, С. Масцерава (Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія, г. Горкі), Л. Лісоўскага (Нараўлянскае РАНА Гомельскай вобласці).

Канферэнцыя дала магчымасць маладым вучоным не толькі апрабіраваць свае работы перад шырокай навуковай аўдыторыяй, але і дазволіла сустрэцца са сваімі калегамі. Тэматыка дакладаў гаворыць аб шырокім коле праблем аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага прыродакарыстання, якімі займаюцца маладыя вучоныя рэспублікі. Патрэбна адзначыць як найбольш цікавыя выступленні Г. Харанічавай (БДУ) —«Рацыянальнае выкарыстанне і ахова ландшафтаў Гомельскага Палесся», І. Цяшкевіча (Мінскі аддзел лабараторыі аэраметадаў) — «Прымяненне аэра- і касмічных здымкаў для вывучэння тэктонікі і некаторыя пытанні аховы прыроды (на прыкладзе Салігорскага прамвузла»), Т. Рослік (Беларускі НДІ ЭМП пры Дзяржплане БССР) — «Метадалагічны падыход да прагнознай ацэнкі стану раслінных рэсурсаў пад уздзеяннем галіновай прамысловасці» і інш.

На высокім узроўні зроблена большасць дакладаў канферэнцыі. Многія работы маладых вучоных змяшчаюць канкрэтныя рэкамендацыі народнай гаспадарцы па пытаннях рацыянальнага прыродакарыстання або з'яўляюцца прамежкавымі этапамі па іх распрацоўцы.

На заключным пасяджэнні было зроблена нямала выказванняў аб важнасці і карысці правядзення такіх канферэнцый, а таксама выказана падзяка савету маладых вучоных геаграфічнага факультэта, яго старшыні А. Вітчанка за вялікую падрыхтоўчую работу і высокі ўзровень правядзення канферэнцыі. Заўважым, аднак, што сярод яе ўдзельнікаў, на жаль, мала было супрацоўнікаў біялагічнага і хімічнага факультэтаў нашага універсітэта.

Маладыя прадстаўнікі універсітэцкай навукі ўдзельнічалі ў мінулым годзе і ў правядзенні рэспубліканскага конкурсу навуковых работ і тэхнічных рашэнняў па праблемах аховы, рацыянальнага выкарыстання і аднаўлення прыродных рэсурсаў, які праводзілі ЦК ЛКСМБ, АН БССР, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР, Дзяржаўны камітэт БССР па ахове прыроды, Беларускае таварыства аховы прыроды. Лаўрэатамі конкурсу сталі супрацоўнікі НДІ ПФП М. Кудзейка, М. Сяргееў, А. Спірыдовіч, К. Утачкін, В. Дзенісенка; географ В. Цухна і біёлаг В. Коннікаў. Ім уручаны дыпломы і грашовыя прэміі. Шэраг маладых вучоных БДУ ўзнагароджаны ганаровымі граматамі.

**В. РАМАНАЎ,**
**старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі возеразнаўства.**

# СВОЙ ПУД СОЛІ

ГАВОРАЦЬ, для таго, каб пазнаць чалавека, трэба з'есці з ім пуд солі. Студэнты дзевятай групы трэцяга курса факультэта прыкладной матэматыкі лічаць, што яны ўжо з'елі свой пуд солі разам. Калектыў групы, па іх меркаванню, дружны, згуртаваны. Вясёлыя, баявыя, добразычлівыя, таварыскія дзяўчаты, якіх пераважная большасць у групе, заўсёды разам: і ў будні, і ў святы. Гэта дружба дапамагае ім і ў вучобе, асабліва ў час сесіі.

Калі што каму незразумела, ён ведае: таварышы заўсёды прыйдуць на дапамогу. Галя Матус, Іра Бірукова, Света Мураўёва, Света Трафіменка не адмовяцца растлумачыць незразумелае, дапамагчы разабрацца ў самых складаных пытаннях, падтрымаць добры настрой.

Дзяўчаты ў вучобе раўняюцца на свайго старасту — Іру Бірукову, якая мінулы семестр закончыла толькі з выдатнымі адзнакамі.

А як сустракаюць трэцякурснікі сесію, якая знамянуе сярэдзіну іх універсітэцкага шляху?

Дзяўчаты гавораць:

— Здаваць першую ў жыцці сесію было шмат цяжэй, чым зараз, — усё было новым, незнаёмым, і самі мы былі нявопытнымі. А цяпер ведаем смак студэнцкага жыцця, набылі такі-сякі вопыт. Мы больш упэўнена сустракаем нашу пятую сесію, сустракаем яе «ў баявой гатоўнасці». Ведаем, што не трэба баяцца сесіі, але добра да яе рыхтавацца неабходна. Тады будзе ўпэўненасць у сваіх сілах і ведах.

**М. ДЗЯДЗЁЛА,**
**студэнтка І курса факультэта журналістыкі.**

**СТАРТУЕ СЕСІЯ**

# *МАНАЛОГ З ТРЫМА ІЛЮСТРАЦЫЯМІ*

ЧАКАЮЦЬ сесію па-рознаму: адны стараюцца хутчэй адагнаць думкі аб ёй і зноў працягваць бесклапотнае жыццё, другія раптам хапаюцца за чытанне праграмнай літаратуры, трэція пераселі з апошняй парты за першую і «ловяць» кожнае слова выкладчыка...



Інтэрнат днём нагадвае соннае царства. І толькі ноччу ён ажывае. Запаўняюцца «чыталкі» на паверхах, пачынаецца калектыўная падрыхтоўка да экзаменаў. Адзін студэнт рыхтуе адно пытанне, другі — другое, трэці — трэцяе і гэтак далей. Потым яны збіраюцца ўсе разам і пачынаюць расказваць адзін аднаму тое, што падрыхтавалі. Па ходу дапаўняюць адзін аднаго.

Сесія... Не выкладчыкам яна патрэбна. І не для таго нават, каб атрымаць добрую адзнаку або перайсці на наступны курс. Яна патрэбна перш за ўсё для цябе, для мяне, для ўсіх нас, студэнтаў. Бо сесія, перш за ўсё, — гэта праверка здольнасцей і сябе як будучага спецыяліста.





Фота М. Дубовіка і В. Маскалёва.

**ГАРЫЗОНТЫ КАФЕДРЫ**

# За радком абавязацельстваў

НАСУПРАЦЬ усіх дваццаці трох пунктаў сацыялістычных абавязацельстваў кафедры вышэйшай матэматыкі — паметкі алоўкам. Уладзімір Міхайлавіч Шыраеў, прафгрупорг кафедры, рыхтуючыся да справаздачы, у каторы ўжо раз правярае вынікі работы за год.

Пунктам першым значыцца: «Прадставіць кандыдацкую дысертацыю да абароны». Дысертацыя прадстаўлена. За сталом насупраць— калега Георгій Пракоф'евіч Размысловіч. Ён і павінен абараняцца ў пачатку года.

«Падрыхтаваць да друку 10 навуковых артыкулаў». Падрыхтавана 26. Добра папрацавалі многія супрацоўнікі кафедры. Дацэнту А. В. Прасолаву належыць шэсць работ. Дзве—аспіранту С. А. Мазаніку. Немалы ўклад у выкананне гэтага пункта і самога праформа — пяць навуковых артыкулаў.

А вось лічба адрэдагаваных матэрыялаў для навуковых часопісаў крышачку меншая, чым запланаваная. На гэта ёсць аб'ектыўныя прычыны: частка супрацоўнікаў кафедры, занятая зараз вывучэннем французскай мовы, у выкананні гэтага абавязацельства не ўдзельнічала,

На стале Уладзіміра Міхайлавіча невялікая зялёная кніжачка з памятным надпісам. Пад рэдакцыяй загадчыка кафедры прафесара Ю. С. Багданава дацэнты В. Т. Воднеў, А. Ф. Навумовіч і старшы выкладчык Н. Ф. Навумовіч выпусцілі дапаможнік «Асноўныя матэматычныя формулы». Кніга адрасуецца студэнтам ВНУ і тэхнікумаў, вучням старэйшых класаў, абітурыентам і г. д.

Выданнем новых вучэбных дапаможнікаў займаюцца ўсе на кафедры. І не толькі таму, што працуе тут кафедральны навукова-метадычны семінар, дзе разглядаюцца падручнікі па матэматыцы, якія рыхтуюцца да друку, але і таму, што для кожнага гэта — першачарговы клопат. Да распрацоўкі пытанняў методыкі выкладання прыцягваюцца слухачы матэматычнага аддзялення ФПК. Яны заняты і ў рабоце кафедральнага семінара.

Кафедра ўдзельнічае ў рабоце конкурснай камісіі па правядзенню Рэспубліканскага агляду студэнцкіх навуковых работ, у кіраўніцтве рэспубліканскага метадычнага аб'яднання выкладчыкаў БССР. (Найбольш актыўныя члены: Ю. С. Багданаў, А. Ф. Навумовіч, Л. П. Чаранкова).

Маладыя выкладчыкі чытаюць лекцыі на занятках школы юных праграмістаў. Тэматыка — самая разнастайная. Для студэнтаў-завочнікаў першых-другіх курсаў чытаюць па тэлебачанню лекцыі з розных раздзелаў алгебры і геаметрыі дацэнты кафедры Л. П. Чаранкова, Ю. Б. Сыроід, Г. В. Мацвееў.

Адметная рыса калектыву —актыўнасць. Нікога не трэба прымушаць удзельнічаць у мерапрыемствах кафедры. Калі трэба, калегі не палічацца з асабістым вольным часам. Але вось... час! Яго заўсёды не хапае. Вялікая вучэбная нагрузка на кафедры. Да таго ж кожны мае грамадскае даручэнне.

Сам Уладзімір Міхайлавіч упершыню выконваў абавязкі прафгрупорга. І справіўся з імі добра. Аб гэтым сведчыць паспяховае выкананне кафедрай сацыялістычных абавязацельстваў.

**Т. САХАШЧЫК.**

СПРАВЫ КАМСАМОЛЬСКІЯ

# РАМАНТЫКА БУДНЯЎ

ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ. Цішыня лекцый змяняецца шумам галасоў у перапынках, а потым — зноў лекцыі, семінары, практычныя заняткі. А ў камітэце камсамола хвілін заціішша не бывае. Заходзяць рабяты, нешта пытаюцца ў сакратара Таццяны Сотчанкі, спрачаюцца, як лепш правесці ў групе тое ці іншае мерапрыемства. Разумееш адразу: гэта не паказное стараннне і імкненне, а стыль работы факультэцкай камсамольскай арганізацыі.

— Ды інакш нам і нельга,— гаворыць Таццяна. — Філалагічны факультэт — адзін са старэйшых ва універсітэце. Традыцыі абавязваюць заўсёды быць наперадзе.

І як сведчанне таго, што філолагі пастаянна ў ліку лідэраў як у семестрах вучэбных, так і працоўных, на відным месцы ў камітэце камсамола змешчаны вымпелы і ганаровыя граматы пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва.

— Але ўсё ж галоўную ўвагу мы заўсёды ўдзяляем вучобе, — працягвае нашу размову Ала Селівон, якая ўзначальвае сектар інтэрнацыянальнай дружбы. — У нас створаны ўсе ўмовы для паспяховай вучобы.

А для таго, каб дапамагчы першакурснікам хутчэй адаптавацца ў студэнцкай сям'і, існуе савет выдатнікаў, члены якога дапамагаюць навічкам у вучобе. Займаюцца студэнты філфака і на факультэце грамадскіх прафесій, вядуць навуковую работу ў студэнцкім навуковым таварыстве...

— Сапраўды, цікавых спраў на факультэце шмат,— працягвае Ала, — было б толькі жаданне ў іх удзельнічаць. Я, напрыклад, не ўяўляю свайго жыцця без удзелу ў грамадскіх справах. Амаль усе мы пасля універсітэта будзем настаўнікамі. Самае галоўнае для нас — набыць вопыт практычнай работы з людзьмі. І калі, як не ў студэнцкія гады, узбагачаць свае веды, расці духоўна.

А магчымасці для гэтага ў філолагаў вялікія. Факультэт шэфствуе над Вязынскай, Хатлянскай школамі, над некалькімі домакіраўніцтвамі. З ахвотай ідуць будучыя настаўнікі да сваіх падшэфных: праводзяць вечары беларускай паэзіі, вечары адпачынку, сустрэчы з замежнымі студэнтамі.

...Цішыня ў факультэцкіх калідорах. Лекцыя. А ў камітэце камсамола рыхтуюцца да чарговага мерапрыемства. Спраў наперадзе вельмі шмат. Бо недалёка той дзень, калі ў Маскве пачне работу XXVI з'езд КПСС. І задача кожнага камсамольца сустрэць яго новымі працоўнымі і вучэбнымі поспехамі.

Іменна адзіны сплаў вучобы і грамадскіх камсамольскіх спраў фарміруе ў нас, студэнтаў, актыўную жыццёвую пазіцыю, ідэйную перакананасць, мэтанакіраванасць палітычнага байца — праваднікаў ў жыццё ідэй партыі.

**М. РАБУШКА,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

● НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

# ЗАПРАШАЕ «ЮНЫ ХІМІК»

**На хімічным факультэце БДУ імя У. І. Леніна шэфскай рабоце ўдзяляецца шмат увагі. Студэнты-хімікі імкнуцца зацікавіць сваіх юных падшэфных, вучняў 39-й і 67-й мінскіх школ, раскрыць перад імі загадкавы свет навукі. Яны дапамагаюць рабятам выпускаць насценгазеты і афармляць кабінеты хіміі, рыхтаваць вечары, віктарыны. Але, мабыць, больш за ўсё прываблівае рабят школа «Юнага хіміка», якая дзейнічае пры факультэце. Заснаваная ў 1964 годзе, яна мае сваю багатую гісторыю і традыцыі. Шмат гадоў кіруе школай дацэнт кафедры аналітычнай хіміі Станіслаў Антонавіч Мячкоўскі.**

**Я знайшла яго сярод групы падшэфных школьнікаў, якія толькі што закончылі экскурсію па кафедрах.**

— Ну, як, рабяты? Спадабалася вам у нас? Хто з вас хоча звязаць сваю будучую прафесію з хіміяй? — Станіслаў Антонавіч усміхнууся, і скаванасці першых хвілін як не бывала. Завязалася ажыўленая гутарка. Яшчэ не ведаючы гэтага чалавека, я міжволі пранікласся да яго сімпатыяй і павагай, так даверліва размаўлялі з ім рабяты, так шчыра, наперабой дзяліліся ўражаннямі.

— Каб займацца ў нашай школе, — гаворыць Станіслаў Антонавіч, — патрэбна характарыстыка-рэкамендацыя настаўніка хіміі і, канешне, вялікае жаданне. Перад залічэннем у школу вызначаецца якасць ведаў вучняў пры дапамозе спецыяльнага субяседавання. І гэта абгрунтавана, бо часам да нас трапляюць выпадковыя людзі.

**— Што прадугледжвае праграма заняткаў! Як яны праходзяць! Ці ўлічваеце вы імкненні школьнікаў да практычнай працы, да творчасці!**

— У «Юным хіміку» створаны дзве групы — з вучняў 9-х і 10-х класаў. Заняткі праводзяцца адзін раз у тыдзень. З рабятамі займаюцца выкладчыкі факультэта — член-карэспандэнт АН БССР, дырэктар інстытута фізіка-хімічных праблем В. В. Свірыдаў, дацэнты Г. А. Папковіч, Л. І. Продан, О. Р. Кулянковіч, В. І. Гергалаў. З іх складаецца савет школы. Хутка ў яго будуць уваходзіць і лепшыя студэнты хімфака. Практычнай частцы адводзіцца большая палова заняткаў. Каб не перагружаць вучняў «сухой» тэорыяй, мы ставім лабараторныя вопыты, асабліва дапытлівым даём магчымасць праявіць сябе ў эксперыментальнай і навукова-даследчай рабоце.

**— Станіслаў Антонавіч, сярод школьнікаў існуе думка, што «Юны хімік» — гэта нешта накшталт падрыхтоўчых курсаў для паступлення ва універсітэт. Ці так гэта?**

— Канешне, не. Наша школа ні ў якім разе не займаецца рэпецітарствам. Яна заклікана расшырыць кругагляд вучняў у галіне хіміі. Праграма выходзіць далёка за вузкія рамкі школьнага курса. Акрамя неарганічнай і агульнай, вучні знаёмяцца з пачаткамі аналітычнай і радыяцыйнай хіміі, хіміі палімераў.

**— Ці дае школа перавагу пры паступленні на факультэт?**

— Многія памылкова думаюць, што характарыстыка «Юнага хіміка» дае права паступіць на хімфак па-за конкурсам. Але яна ўлічваецца толькі пры роўнай колькасці балаў. У гэтым годзе з 12 рабят, скончыўшых школу, паступілі сямёра. «Юны хімік» чакае папаўнення.

**Інтэрв'ю правяла В. ВОБЛІКАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА

# ВАЖНА ПРАВЕРЫЦЬ СІЛЫ

ЧАС ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ прайшоў вельмі хутка. Яшчэ зусім нядаўна на устаноўчай канферэнцыі мы з хваляваннем слухалі пяцікурснікаў, якія жадалі нам поспехаў, расказвалі пра свае радасці сустрэч з вучнямі, пра некаторыя складаныя моманты вучэбна-выхаваўчага працэсу ў школе.

Слухаючы выступленні нашых старэйшых таварышаў, мы задумваліся над тым, як нас сустрэнуць у школе настаўнікі і вучні, бо ад гэтага залежыць многае ў працы пачынаючага педагога. Калі школа прыме практыкантаў з радасцю і верай у іх здольнасці, то поспехі, несумненна, будуць, тады захочацца працаваць як мага лепш. Для пачынаючых педагогаў вельмі важна атрымаць магчымасць паспрабаваць сябе самастойна.

І вось пачаліся першыя выпрабаванні, напружаная, натхнёная і творчая праца. Мы не ведалі, з чаго пачынаць, бо амаль ніякага педагагічнага вопыту ў нас не было, калі не лічыць месяца практыкі. Але ж у школе праца зусім іншая, чым у піянерскім лагеры.

Хутка мы самастойна пачалі даваць урокі. Трэба сказаць, што гэтыя пачатковыя спробы ў педагагічнай працы былі далёка не бліскучымі. Мы на першых уроках з-за сваёй разгубленасці часам не маглі адказаць на самыя простыя пытанні вучняў, злаваліся на іх, што не разумеюць нашага тлумачэння.

Практыка ў школе навучыла нас многаму. Яна дала нам магчымасць на канкрэтнай справе праверыць свае сілы, свае здольнасці, свае тэарэтычныя веды.

**В. БОЕК,**
**Л. КАЛАДЗІНСКАЯ,**
**студэнткі філфака.**

# ЛІРЫЧНЫ ЎСПАМІН

...МНЕ ВЕЛЬМІ ПАШАНЦАВАЛА: я была класным кіраўніком вучняў самых дружных, самых сумленных, самых справядлівых, па-дзіцячаму наіўных і па-даросламу разумных.

Каб зразумець, якія твае выхаванцы, трэба пабыць разам, паназіраць за імі, заваяваць давер'е. У школу мы прыйшлі, амаль нічога не ведаючы, не ўяўляючы сабе, што такое правесці ўрок, застацца з класам у 40 чалавек адзін на адзін, ставіць адзнакі, прычым аб'ектыўна. Я памятаю той адкрыты ўрок, на якім прысутнічала 11 дарослых чалавек, а яны, мае «Міколкі-паравозы», так адказвалі, так актыўна працавалі, так уважліва слухалі, дапамагалі мне, што мой страх і хваляванне як рукой зняло. А пасля ўрока яны сабраліся ўсе разам у класе і дружна ўголас скандзіравалі: «Віншуем!». Яны вельмі хваляваліся за мае адзнакі на заліковых уроках.

Якімі цудоўнымі і незабыўнымі сталі для нас паход у планетарый, піянерскія зборы «Пагаворым аб гальштуку», «Піянер і прырода», гутарка «Раскажы мне пра мяне» і інш. Да ўсіх мерапрыемстваў рабяты вельмі старанна рыхтаваліся, да самазабыцця праседжвалі на рэпетыцыях. Яны самі вялі зборы, задавалі пытанні сваім таварышам. Кім толькі не мараць стаць мае «чамучкі»: і лётчыкамі, і ўрачамі, і маракамі, і вучонымі, і заолагамі...

Вялікую ролю ў выхаванні маіх пяцікласнікаў адыграла класны кіраўнік Г. К. Яфімава, чалавек вялікай душы. Гэта яна навучыла рабят быць працавітымі, уважлівымі адзін да аднаго. Ёй я абавязана ўсімі сваімі поспехамі, якіх дасягнула ў самастойнай рабоце. Заўсёды з вялікай падзякай буду ўспамінаць яе. Хачу дадаць, што Г. К. Яфімава — выпускніца нашага факультэта.

**Л. БУЦАЛЕВА,**
**студэнтка філфака.**



**На журфаку адбылася студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 80-годдзю газеты «Іскра». НА ЗДЫМКУ: у час пасяджэння.**
**Фота А. Стадуба.**

# КАНТАКТЫ ПАШЫРАЮЦЦА

Яркім прыкладам супрацоўніцтва паміж Беларускай ССР і Народнай Рэспублікай Балгарыя з'яўляюцца брацкія кантакты паміж БДУ імя У. І. Леніна і Сафійскім універсітэтам імя К. Ахрыдскага, якія плённа развіваюцца ўжо больш як 15 год.

Заключаны ў снежні 1966 года дагавор аб навуковым супрацоўніцтве прадугледжваў аказанне ўзаемнай дапамогі ва ўдасканаленні вучэбнага працэсу, рэгулярны абмен прафесарамі і выкладчыкамі для чытання курсаў і асобных лекцый і вывучэнне вопыту арганізацыі вучэбнай, выхаваўчай і навуковай работы, узаемны абмен літаратурай, вучэбнымі планамі, праграмамі і г. д. У дагаворы гаварылася аб устанаўленні цесных сувязей паміж грамадскімі арганізацыямі абодвух бакоў. З тае пары ў НРБ выязджала больш чым 100 прафесараў і выкладчыкаў, у Сафійскім універсітэце чыталі курс лекцый па актуальных навуковых напрамках прафесары А. Е. Супрун, А. А. Галаўко, М. Т. Раманоўскі, Л. М. Шакун і інш.

З цікавымі лекцыямі выступалі і вядомыя вучоныя з Сафійскага універсітэта. Ужо другі год выкладае балгарскую мову на філфаку БДУ дацэнт Сафійскага універсітэта Блажо Ілieў. Фізічны, механіка-матэматычны, філалагічны факультэты, факультэт прыкладной матэматыкі прымалі балгарскіх стажораў. Паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі 10 аспірантаў.

У апошнія гады найбольш эфектыўнай формай узаемадзеяння дзвюх ВНУ стала сумесная распрацоўка навуковых даследаванняў. Прыкладам можа служыць інтэграцыя творчых намаганняў універсітэцкіх кафедраў фізікі паўправаднікоў. У выніку аб'яднання работы абодвух калектываў былі зроблены сумесныя адкрыцці, якія зарэгістраваны ў СССР і НРБ. Прамысловае прымяненне толькі аднаго з іх дало гадавы эканамічны эфект 120 тысяч рублёў. Вучоныя Беларускага і Сафійскага універсітэтаў удзельнічаюць у навуковых канферэнцыях, калёквіумах, сімпозіумах, якія праводзяцца ў нас і ў Сафіі.

Балгарская праблематыка стала аб'ектам даследавання гісторыкаў, філолагаў, географаў, юрыстаў, выкладчыкаў грамадскіх кафедраў, займае ўсё большае месца ў навучальным працэсе. Студэнты гістфака вывучаюць гісторыю Балгарыі, ім чытаюцца спецыяльныя курсы аб сацыялістычным будаўніцтве ў Балгарыі, гісторыя балгара-савецкіх адносін, беларуска-балгарскіх гістарычных сувязей.

На філфаку выкладаюцца балгарская мова, гісторыя балгарскай літаратуры, пішуцца курсавыя і дыпломныя работы.

Бібліятэка БДУ вядзе кнігаабмен з бібліятэкамі Сафійскага універсітэта, Народнай бібліятэкай імя Кірылы і Мяфодзія.

Традыцыяй стала правядзенне савецка-балгарскіх студэнцкіх навуковых канферэнцый у час Тыдня дружбы. На гэты раз чарговая канферэнцыя была прысвечана 110-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна і трыццаціпяцігоддзю Перамогі над фашысцкай Германіяй.

Ва універсітэце працуе лекторый, на гістфаку створана аўдыторыя савецка-балгарскай дружбы. Кантакты паміж універсітэтамі-пабрацімамі пашыраюцца.

**Д. МЕЛЬЦАР,**
**прафесар.**

СПОРТ • СПОРТ • СПОРТ • СПОРТ

АКРАБАТЫКА

# КАБ АТРЫМАЛАСЯ САЛЬТА

КОЛЬКІ ЭНЕРГІІ і ўмення трэба ўкласці ў выкананне простага фляка ці сальта! Нейкае імгненне ў паветры—і ты зноў на зямлі. Толькі застаецца незабыўнае ўражанне аб казачным палёце...

Секцыю акрабатыкі ў БДУ імя У. І. Леніна вядзе трэнер М. Ц. Бязручанка. Ён заўсёды ўважлівы да сваіх падапечных і аднолькава патрабавальны да ўсіх. І калі крыху стомішся на трэніроўцы, падыдзе і скажа: «Паспрабуй што-небудзь лягчэйшае...» І добра становіцца на душы.

Трэба сказаць, што ў нашу секцыю акрабатыкі ходзяць людзі розных узростаў, пачынаючы ад школьнікаў малодшых класаў і канчаючы намі, студэнтамі II курса. Зразумела, часам прыходзіцца нялёгка, але мы вучымся адзін у аднаго ўжо набытаму невялічкаму вопыту і майстэрству.

...Рамантыкі імгненнага палёту — так называюць акрабатаў. Пастаянная каардынацыя рухаў. Без гэтага немагчыма направіць сваё цела для выканання нават самага простага элемента. І вось бар'ер пераадолены. Самае простае —правільна ўстаць з мосціка, што давалася з цяжкасцю — становіцца тваёй маленькай перамогай над сабой. Нехта ў час трэніровак нашай секцыі весела спытаў: «Дык дзе ж вашы медалі?» Мы моўчкі глядзелі на яго і думалі, што не заўважыў гэты чалавек галоўнага — радасці спорту. Умець разлічваць вольны час, якога ў студэнта заўсёды мала, умець валодаць сабой — вось чаму навучыцца кожны ў спартыўнай секцыі акрабатыкі.

**В. ДЗЯДКОВА,**
**студэнтка II курса факультэта журналістыкі.**

ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА

## «МІШЭНІ ЗАСТАЮЦЦА ЧЫСТЫМІ»

**У матэрыяле, змешчаным у газеце («Беларускі універсітэт», № 33 (1297) ад 4 снежня 1980 года) крытыкавалася секцыя кулявой стральбы. Рэдакцыя атрымала рэагаванне в. а. загадчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту С. У. Макараэвіча:**

«Кафедра мае ў сваім штаце аднаго выкладчыка па кулявой стральбе. Былі прыняты меры, каб залічыць яшчэ аднаго выкладчыка для работы са зборнай камандай. Аднак спецыялістаў такога профілю вельмі мала. Мінскі інстытут фізічнай культуры рыхтуе ў год толькі 5 чалавек са спецыялізацыяй па кулявой стральбе.

Для больш шырокай папулярызацыі стралковага спорту кафедрай фізвыхавання рыхтуюцца грамадскія інструктары з ліку студэнтаў».

# 20 ГОД— БУДОЎЛЯМ БДУ

З ЮБІЛЕЕМ!

АДНАМУ са старэйшых работнікаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, старшаму інжынеру аддзела капітальнага будаўніцтва Ананію Цімафеевічу Шышкіну споўнілася 80 год. Адначасова мы адзначылі 58-годдзе працоўнай дзейнасці юбіляра.

Маладым камсамольцам пасля заканчэння ў 1923 годзе Чыцінскага політэхнікума ён быў накіраваны на работу ў Забайкальскі губком ВКП(б). З 1930 года працаваў у будаўнічых арганізацыях Баргузіна, Іркуцка і Чыты. У 1937 годзе Ананій Цімафеевіч прызываецца ў рады Савецкай Арміі, у якіх служыць да 1960 года.

Пасля звальнення ў запас, з 1960 года, паступае на работу ў Беларускі дзяржаўны універсітэт на пасаду старшага інжынера аддзела капітальнага будаўніцтва. 20 год работы ў БДУ Ананій Цімафеевіч прысвяціў інжынернаму забеспячэнню і камплектацыі аб'ектаў універсітэта. Важкі ўклад у будаўніцтва 7 вучэбна-лабараторных карпусоў, 6 студэнцкіх інтэрнатаў, 2 жылых дамоў для прафесарска - выкладчыцкага саставу, 7 студэнцкіх сталовых унесены Ананіем Цімафеевічам. Сціплы і чулы працаўнік, член КПСС з 1926 года, А. Ц. Шышкін са сваімі абавязкамі спраўляецца заўсёды паспяхова. Неаднаразова за датэрміновы ўвод аб'ектаў у эксплуатацыю ён узнагароджваўся граматамі і грашовымі прэміямі.

Ветэран КПСС, ветэран працы Ананій Цімафеевіч Шышкін знаходзіцца ў добрым здароўі і бадзёрым настроі. У сувязі са слаўнай датай і вялікім працоўным укладам юбіляра ў будаўніцтва матэрыяльнай базы Белдзяржуніверсітэта ад імя супрацоўнікаў аддзела і сяброў жадаем яму моцнага здароўя, асабістага шчасця і дабрабыту.

**А. МАРЫНІЧ,**
**начальнік аддзела капітальнага будаўніцтва БДУ.**



Летуценнік. Фотаэцюд **М. Дубовіка.**

МЕТАДЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

# ШТО І ЯК ЧЫТАЦЬ СТУДЭНТУ

ПА ПЛАНУ МІНІСТЭРСТВА вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР фундаментальная бібліятэка Белдзяржуніверсітэта, якая на працягу 5 год з'яўляецца метадычным цэнтрам бібліятэк ВНУ рэспублікі, правяла на базе політэхнічнага інстытута рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю на тэму «Кіраўніцтва чытаннем студэнтаў ва ўмовах бібліятэкі ВНУ». 120 бібліятэчных работнікаў беларускіх інстытутаў і універсітэтаў, а таксама з Уфы, Варонежа, Курска, Калініна, Арджанікідзе, Кубані і Малдавіі праслухалі 19 дакладаў. Два з іх: «Кіраўніцтва чытаннем студэнтаў у бібліятэках ВНУ рэспублікі ў святле пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы» і «Аб некаторых пытаннях методыкі кіраўніцтва чытаннем у эксперыментальнай групе» падрыхтавалі дырэктар бібліятэкі БДУ І. У. Арэхоўская і галоўны бібліятэкар З. М. Шалупенка.

Фарміраванне ўсебакова развітой асобы, комплексны падыход да кіраўніцтва чытаннем студэнтаў, роля бібліятэкі ВНУ ў арганізацыі самастойнай работы студэнта з кнігай, культура чытання і яе роля ў авалоданні навыкамі самастойнай работы з кнігай, методыка вывучэння чытання студэнцкай моладзі — вось няпоўны пералік абмеркаваных тэм.

Табліцы па вывучэнню інтарэсаў чытачоў і кіраўніцтву чытаннем рыхтаваў навукова-метадычны аддзел універсітэцкай бібліятэкі пад кіраўніцтвам З. А. Макеенкі.

З асаблівай прафесійнай зацікаўленасцю усе ўдзельнікі канферэнцыі пасля апошняга пасяджэння абмяняліся вопытам работы па фарміраванню інтарэсаў студэнтаў-чытачоў.

**А. СІНКЕВІЧ,**
**загадчыца аддзела рэдкай кнігі бібліятэкі БДУ.**

Камертон
МУЗЫЧНЫ КЛУБ

**ГОСЦІ ГАРАДСКОГА ФЕСТЫВАЛЮ САМАДЗЕЙНАЙ ПЕСНІ Ў БДУ імя У. І. ЛЕНІНА**

# РАСКРЫЦЦЁ ТАЛЕНТУ

Ленінградскі спявак і кампазітар Рыгор Гладкоў. Ён з'яўляецца членам мінскага гарадскога клуба песні. Яго голас гучаў у радыёперадачах для дзяцей. Таму сваё выступленне Рыгор пачаў з «Карціны»— вядомай дзіцячай песні. Змест яе просты, займальны. Яна разлічана на самых «вялікіх людзей у свеце». Поспехам сярод дзяцей карыстаюцца яго песні, якія напісаны іх думкамі, іх уяўленнямі.

Для кампазітара мала напісаць музыку да верша. Яго талент іменна праяўляецца ва ўменні іх арганічна спалучаць. Песня «Спозаранку» на верш Міхаіла Яснова якраз з'яўляецца ўдалым прыкладам гэтага. Цікава, што кіеўскі рэжысёр Аляксандр Татарскі здымае зараз фільм, у якім гэта песня будзе адыгрываць ролю музычнага сцэнарнага стрыжня.

У выкананні Рыгора Гладкова шмат песень на словы Аляксандра Кушнера. «Калі чытаю яго вершы,— шчыра прызнаецца Рыгор—... я пішу музыку». Да гэтых слоў дададзім, што спявак заўсёды адчувае аўдыторыю, свабодна паводзіць сябе на сцэне. Гітара ў яго руках — сапраўдны цуд.

Галіна Багданоўская і Аляксей Бруноў. Спачатку крыху аб іх. У Мінску былі некалькі разоў. Аляксей па прафесіі геолаг, Галіна закончыла Ленінградскі інстытут кінаінжынераў. У адрозненне ад Р. Гладкова ў іх няма сваіх песень.

— Лічу, што лепш выконваць добрыя чужыя песні, чым свае дрэнныя,— шчыра сказала Г. Багданоўская.

Іх выступленні вельмі глыбокія па зместу. Яны адрасаваны сучаснай моладзі. Тэматыка песень, якія выконваюцца Г. Багданоўскай і А. Бруновым, шырокая.

**А. СЛАБАДЧУК.**

Желаю Вам того,
чего желаю себе сам.
Григорий Гладков.

Читателям газеты
„Белорусский университет"
желаю человечности
в отношениях, в любой
жизненной ситуации
Ал. Брунов
[подпись]

• З НАШАЙ ПОШТЫ

## ПОБАЧ СЯБРЫ

У мінулым годзе я прыехаў у Мінск, каб навучыцца складанаму майстэрству журналіста. Вучоба давалася цяжка. Але са мной побач заўсёды былі сябры Вольга Мароз, Леанід Вашко. Рэгулярныя заняткі з імі дазволілі хутка асвоіць рускую мову, спецыяльныя дысцыпліны.

Я ўпэўнены, што і ў будучым яны заўсёды прыйдуць мне на дапамогу.

**Уеслаці АБІБ,**
**студэнт II курса факультэта журналістыкі.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
8 студзеня 1981 г.
АТ 02012 Заказ 58.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 22-07-19.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ